# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 3(49) 2006**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
*(нам. галоўнага рэдактара)*
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
*(нам. галоўнага рэдактара)*
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч

Весці БДПУ №3 (сер 3), 2006

### *Гісторыя*

*Бушчык Г. П.* Мінск у міжрэспубліканскіх эканамічных сувязях (1950—1990 гг.) ........ 3
*Янкоўская Т. У.* Перадумовы распрацоўкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Беларусі ........ 11
*Вялікі А. Ф.* Савецка-германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі ў 1939—1940 гг. ........ 15
*Крывіцкі Д. С.* Германскія спецслужбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (май 1941 — сакавік 1942 г.) ........ 18
*Пуцік У. С.* Аграрна-сялянскія праблемы ў праграмах і дзейнасці партый і грамадскіх рухаў правага кірунку ў Беларусі падчас Першай расійскай рэвалюцыі ........ 22
*Біндараў А. В.* Роля царкоўнапрыходскіх школ у правядзенні нацыянальна-рэлігійнай палітыкі ў Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. ........ 26
*Цымбал А. Г.* Усталяванне аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы ў першай палове 20-х гг. XX ст. ........ 30
*Крывіцкая К. В.* Прафранцузскія настроі насельніцтва Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай воласці напярэдадні вайны 1812 г. ........ 34
*Груца І. А.* Версіі лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона, звязаныя з азёрамі Семлеўскае і Стаячае, іх крытыка ........ 37
*Калечыц І. Л.* Эпіграфічныя помнікі X — першай паловы XIV ст. як адлюстраванне сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ........ 41
*Цзян-Шу-і.* Расійска-тайваньскія адносіны ў пачатку 90-х гг. XX ст. ...станаўленне «тайванязнаўства» ў Расіі ........ 43

### *Філасофія*

*Кавалевіч М. С.* Станаўленне сінергетычнага падыходу ...а даследавання працэсаў прафесійнага самавызначэння ........ 47
*Юрашэвіч І. П.* Усходнеславянскі цывілізацыйны тып у сістэме ...ыялогу культур Усходу і Захаду ........ 50
*Васько І. І.* Асэнсаванне прыроды і прызначэння дзяржаўнай улады ...сучаснай сацыяльнай думцы Рускай Праваслаўнай Царквы ........ 54

### *...літалогія*

...чанка В. А., *Паўлава Н. В.*, *Сцяпанаў Г. І.* Станаўленне ...ртыйнасці як умова фарміравання грамадзянскага ...ства ў Рэспубліцы Беларусь ........ 61
...умаў Дз. І., *Саланінка А. Дз.* Рэфармацыя и генезіс палітычнай ...ы беларускага соцыуму ........ 63

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАЛІТАЛОГІЯ

УДК 329(476)

***В. А. Зенчанка, Н. В. Паўлава, Г. І. Сцяпанаў***

## СТАНАЎЛЕННЕ ШМАТПАРТЫЙНАСЦІ ЯК УМОВА ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКАГА ГРАМАДСТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Праблема фарміравання грамадзянскага грамадства набывае ў сучасных умовах асаблівую актуальнасць. Асновай грамадзянскага грамадства — гэта вольная, раўнапраўная, адказная за свае ўчынкі і дзеянні асоба, гэта свабоднае існаванне мноства сацыяльных груп з рознымі, нярэдка супрацьлеглымі інтарэсамі. Таму ўсе арганізацыі, інстытуты, якія заклікаюць садзейнічаць рэалізацыі інтарэсаў, мэт, імкненняў як асобнай асобы, так і розных груп насельніцтва, з'яўляюцца важнейшымі складальнымі элементамі ў шматпланавай канструкцыі грамадзянскага грамадства.

Адным з гэтых элементаў і ўмоў развіцця грамадзянскага грамадства ў палітычнай сферы выступаюць шматпартыйнасць, існаванне розных палітычных партый, ідэй і поглядаў. Сусветны вопыт сведчыць, што толькі палітычныя партыі, г. зн. арганізацыі грамадзян, якія маюць канстытуцыйнае права весці барацьбу дэмакратычным шляхам за палітычную ўладу, здольны найбольш паслядоўна адстойваць інтарэсы прадстаўляемых імі розных груп насельніцтва. У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях» (ад 19 ліпеня 2005 г.) палітычная партыя вызначаецца як дабравольнае грамадскае аб'яднанне, што праследуе палітычныя мэты, якія садзейнічаюць выяўленню і выражэнню палітычнай волі грамадзян і ўдзелу іх у выбарах. Заканадаўства не ўтрымлівае патрабавання прадстаўніцтва членаў палітычных партый у выбіраемых насельніцтвам органах або службовых асоб. Выражаючы інтарэсы пэўных сацыяльных груп, партыі садзейнічаюць іх унутранай самаарганізацыі, усведамленню сваіх інтарэсаў, іх магчымасцей, суадносін гэтых інтарэсаў з інтарэсамі іншых слаёў грамадства. Праз партыі перш за ўсё ажыццяўляецца прамая і адваротная сувязь у сістэме «грамадзяне — дзяржава».

У сучаснай Беларусі шматпартыйнасць пачала складвацца ў канцы 80-х — пачатку 90-х гг. XX ст. Прававой асновай для станаўлення шматпартыйнасці стала адмена артыкула 6-га Канстытуцыі СССР на з'ездзе народных дэпутатаў СССР (1990 г.), які прадугледжваў манапольнае права КПСС на кіруючую ролю ў грамадстве. Крах таталітарнага рэжыму аказаў канструктыўны ўплыў на масавую псіхалогію і сацыяльнае адчуванне людзей. І хоць гэты ўплыў значна больш ахопліваў сферу эмацыяльна перажываемых каштоўнасцей, чым практычныя веды аб новай грамадскай рэчаіснасці і аптымальных спосабах паводзін у новых умовах, тым не менш ён стварыў пэўныя ўмовы для абуджэння грамадзянскай актыўнасці беларускага народа.

Пераход да шматпартыйнасці быў абумоўлены ўнутранымі і знешнімі, ідэалагічнымі і эканамічнымі прычынамі. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэта Беларусі, з'яўленне магчымасці вывучаць і аналізаваць палітычны вопыт іншых краін, выспяванне даволі шырокіх грамадскіх меркаванняў аб неабходнасці палітычнага плюралізму, паглыбленне ў грамадстве крызісу даверу да панаваўшай многія дзесяцігоддзі марксісцка-ленінскай ідэалогіі, працэс грамадскіх пераўтварэнняў, паступовы рух да дамінавання рыначных адносін і разнастайнасці форм уласнасці, якасныя пераўтварэнні ў сацыяльнай структуры з непазбежнасцю прывялі да несупадзення сацыяльных і палітычных інтарэсаў грамадзян да розных ідэалагічных падыходаў у вырашэнні праблем грамадскага жыцця. Гэта знайшло адлюстраванне ў арганізацыі ў канцы 80-х гг. так званых нефармальных грамадскіх рухаў, з'яўленню палітызаваных груп, клубаў, асацыяцый, партый.

Шматпартыйная сістэма ў Беларусі пачала фарміравацца са стварэння аргкамітэта (кастрычнік 1988 г.) па ўтварэнні Беларускага народнага фронту, які спачатку выступаў як грамадскі рух, пераўтварыўшыся фактычна ў пачатку 90-х гг. у палітычную партыю. Пасля расколу ў 1999 г. на яго аснове ўтварыліся дзве партыі: Кансерватыўна-Хрысціянская партыя БНФ і Партыя БНФ. Першай зарэгістраванай у Міністэрстве юстыцыі стала Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, якая абвясціла ў якасці афіцыйнай партыйнай ідэалогіі лібералізм.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

На працягу 90-х гг. у Беларусі было створана больш за сорак партый, якія адлюстроўвалі спектр палітычных напрамкаў. Аднак, з'яўляючыся прадуктам адносна кароткачасовага грамадскага настрою, партыі, узнікшыя ў пачатку дэмакратычных змен, не прывялі да ўзнікнення ў грамадскай свядомасці ўстойлівых грамадзянскіх сацыяльна-псіхалагічных арыентацый, да фарміравання такой сістэмы масавых сацыяльна-псіхалагічных уяўленняў, якія маглі б легчы ў аснову развіцця грамадзянскага грамадства. Большасць партый так і не змагло схіліць на свой бок значную колькасць прыхільнікаў, аказаць пазітыўны ўплыў на палітычны працэс у рэспубліцы. Некаторыя з іх аб'ядналіся, іншыя распаліся, трэція, вычарпаўшы свае рэсурсы, сышлі з палітычнай арэны. Зараз у Міністэрстве юстыцыі зарэгістравана 17 палітычных партый. Тым не менш беларускае грамадства пакуль што знаходзіцца на пачатковым этапе працэсу фарміравання рэальнай шматпартыйнасці.

Важным этапам у фарміраванні заканадаўчай базы шматпартыйнасці стала прыняцце 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у якой былі зафіксаваны правы чалавека і грамадзяніна, у тым ліку права на свабоду палітычных аб'яднанняў. Гарантыяй забеспячэння палітычнага плюралізму ў краіне з'яўляецца палажэнне Канстытуцыі аб тым, што ідэалогія палітычных, рэлігійных або іншых грамадскіх аб'яднанняў, сацыяльных груп не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для грамадзян. Новая рэдакцыя Канстытуцыі, прынятая на ўсенародным рэферэндуме ў лістападзе 1996 г., захавала гэтыя прынцыповыя палажэнні.

Станаўленне рэальнай шматпартыйнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь праходзіць у дастаткова складаных і супярэчлівых умовах. Аб гэтым сведчыць той факт, што ў палітычным спектры шматпартыйнасці так і не сфарміраваліся ўплывовыя цэнтрысцкія сілы, якія маглі б адыгрываць канструктыўную ролю ў вырашэнні найбольш актуальных праблем сучаснага беларускага грамадства. Па сутнасці, гэту нішу занялі ўладныя структуры, якія сталі своеасаблівай цэнтрысцкай сілай — «партыяй улады», якая рэальна рэгулюе грамадска-палітычнае жыццё краіны. У выніку цэнтрысцкія пазіцыі фарміруюцца не «знізу», а «зверху». Ва ўмовах крызісу і нестабільнасці такое становішча мае пэўнае станоўчае значэнне. Аднак у далейшым яно можа стать дэстабілізуючым фактарам для паспяховага развіцця і функцыяніравання рэальнай шматпартыйнасці, станаўлення развітога грамадзянскага грамадства.

У сілу незавершанасці і супярэчлівасці працэсу станаўлення шматпартыйнасці ў Рэспубліцы Беларусь даволі складана даць дакладную класіфікацыю беларускіх партый. Тым не менш можна вылучыць асноўныя віды палітычных партый Беларусі па іх ідэйна-палітычнай арыентацыі.

1. Партыі камуністычнай арыентацыі: Партыя камуністаў Беларуская; Камуністычная партыя Беларусі.
2. Партыі прасацыялістычнай арыентацыі: Аграрная партыя; Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці; Беларуская патрыятычная партыя.
3. Партыі сацыял-дэмакратычнай арыентацыі: Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя; Партыя «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада»; Сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды; Рэспубліканская партыя.
4. Партыі ліберальна-дэмакратычнай арыентацыі: Аб'яднаная грамадзянская партыя; Ліберальна-дэмакратычная партыя.
5. Партыі нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі: Партыя БНФ; Кансерватыўна-Хрысціянская партыя БНФ.

У Беларусі дзейнічае шэраг так званых партый інтарэсаў, партый прагматычнага толку, ідэйна-палітычныя арыентацыі якіх дакладна не акрэслены: Беларуская партыя жанчын «Надзея»; беларуская палітычная партыя «Зялёныя»; Беларуская экалагічная партыя зялёных «БЭЗ»; «Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя [1].

Характэрнай асаблівасцю фарміравання шматпартыйнай сістэмы ў Беларусі з'яўляецца тое, што пасля рэферэндуму 1996 г. у апазіцыі ў адносінах да ўладных структур аказаліся не толькі правыя партыі, але і Партыя камуністаў Беларуская. І правыя партыі, і ПКБ адмоўна адносяцца да метадаў палітычнай дзейнасці кіраўніцтва рэспублікі, называючы іх дыктатарскімі. Аднак такое збліжэнне на аснове непрымірымага адмаўлення, а не пазітыўнай палітычнай праграмы не можа быць устойлівым и доўгім. Акрамя таго, многія радавыя члены і значная частка электарату правага і левага палюсоў палітычнага спектра асудзілі сам факт такога збліжэння з палітычным апанентам. Гэта знайшло, у прыватнасці, выражэнне ў расколе БНФ, у пераходзе шэрага пярвічных арганізацый ПКБ у рады Камуністычнай партыі Беларусі.

Наогул, трэба адзначыць, што палітычная апазіцыя ў Беларусі расколата, не мае адзінай канструктыўнай платформы, агульнага прызнанага лідэра, арганізацыйных структур, агульнай ідэалогіі і выверанай мадэлі грамадскага развіцця. Апазіцыйныя партыі не ў ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

...не дасягнуць нават мінімальнай кансалідацыі ...ць бы на базе найбольш агульных грунтоўных каштоўнасцей (дэмакратыя, суверэнітэт, знешнепалітычны курс і г. д.). Такім чынам, уплыў цяперашняй апазіцыі на палітычны працэс аб'ектыўна не можа быць вызначальным.

Аб гэтым сведчаць і вынікі выбараў у Палату прадстаўнікоў 3-га склікання 2004 г. Так, у працэсе выбарчай кампаніі АГП вылучыла 57 кандыдатаў у дэпутаты вышэйшага прадстаўнічага органа краіны, БСДП «Народная Грамада» — 56, БСДГ — 16, Партыя БНФ — 40 [2]. Аднак дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў сталі толькі кандыдаты ад трох палітычных партый (КПБ атрымала 8 месц, Аграрная партыя — 3 і Ліберальна-дэмакратычная партыя — 1).

Такім чынам, вынікі выбараў паказалі не толькі слабасць апазіцыі, але і наогул слабасць партыйнай сістэмы ў Беларусі, нязначны ўплыў партый на дзяржаўную палітыку і наглядна адлюстравалі тэндэнцыю яго зніжэння. Уздзеянне і ўплыў партый на палітыку дзяржавы праходзіць на фоне зніжэння ступені даверу насельніцтва да саміх партый, што звязана перш за ўсё з зацягнуўшымся працэсам іх структурызацыі, адсутнасцю ў іх надзейнай сацыяльнай базы, цеснай сувязі з выбаршчыкамі, расплывучатасцю іх ідэйных пазіцый, асабістымі амбіцыямі партыйных лідэраў, падабенствам праграмных установак шэрага палітычных партый, нездавальняючай і неэфектыўнай работай з рознымі катэгорыямі насельніцтва. Таму большасць партый нешматлікія і не карыстаюцца шырокім даверам у грамадзян.

У цэлым можна канстатаваць, што шматпартыйная сістэма Рэспублікі Беларусь знаходзіцца на пачатковым этапе свайго развіцця. За мінулыя гады толькі некаторыя з іх сумелі сфармаваць ці захаваць свае пазіцыі ў палітычным жыцці краіны, стварыць разгалінаваную сетку сваіх мясцовых арганізацый ва ўсіх абласцях Беларусі. Абсалютная большасць грамадзян па-ранейшаму слаба разбіраецца ў шматпартыйнасці і не аказвае ні адной з партый шырокага даверу.

Такое становішча ў многім звязана з тым, што ў адрозненне ад Захаду наша краіна пакуль не мае практычнага навыку самаарганізацыі ў сістэме «дзяржаўная ўлада — грамадзянскае грамадства». Адсутнічаюць і моцныя дэмакратычныя традыцыі. Беларускае грамадства яшчэ знаходзіцца на стадыі сістэмнай трансфармацыі. У ім пакуль не склаліся ўстойлівыя сацыяльныя групы, якія ўсведамляюць свае групавыя інтарэсы і гатовы абараняць іх праз палітычную дзейнасць з дапамогай палітычных партый. Перспектывы партый залежаць ад таго, наколькі яны будуць выражаць інтарэсы грамадзян.

Безумоўна, што з паступовым рэфармаваннем эканомікі структураванне розных сацыяльных сіл, маючых свае спецыфічныя інтарэсы, паскорыцца. Гэта стане аб'ектыўнай перадумовай арганізацыйнага афармлення гэтых сіл у палітычныя партыі, узбуйнення апошніх і стварэння развітой партыйнай сістэмы. Магчыма, што шэраг партый пачне фарміравацца як бы з пачатку. У значнай ступені інтэнсіўнасць гэтага працэсу будзе залежаць ад здольнасці суб'ектаў палітычнай дзейнасці зрабіць рашучы паварот да кансалідацыі з шырокімі слаямі насельніцтва, рэальнага выражэння і абароны іх неадкладных інтарэсаў, прыняць цывілізаваныя правілы «палітычнай гульні», а блізкім па сваіх праграмных устаноўках партыям знайсці агульныя каштоўнасці і праявіць дастатковую волю для аб'яднання.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

*Літаратура*


1. *Соловей Т. Г.* Политические партии и партийные системы. — Минск : БГУ, 2006.— С. 56.— 57.
2. Советская Белоруссия. 2004. 2 сент.



*Summary*

*We analyze problems, tendencies and perspectives of multiparty system Constitution in the Republic of Belarus, which is one of the main attributes of developed civil society formation.*


*УДК 32.001(476)*

***Дз. І. Навумаў, А. Дз. Саланінка***

# РЭФАРМАЦЫЯ І ГЕНЕЗІС ПАЛІТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА СОЦЫУМУ

Выступаючы ў якасці важнейшай сацыякультурнай дэтэрмінанты генезісу палітычнай культуры беларускага соцыуму, рэлігійна-канфесіянальны фактар у той жа час аказаў амбівалентны характар на дадзены працэс. У гісторыі Беларусі міжканфесіянальныя супярэчнасці ў пэўнай ступені абумовілі рэлігійны, палітычны і сацыяльны раскол беларускага грамадства, тым самым насыціўшы тканіну нацыянальнай палітычнай культу-